В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

## Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# АРФАГРАФІЯ

**Арфаграфія** — гэта раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца агульнапрынятыя правілы перадачы вуснай мовы на пісьме.

## Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе

Фанетычны прынцып патрабуе, каб гукавы склад слова перадаваўся на пісьме адпаведна літаратурнаму вымаўленню.

### 1. Правапіс О, Э — А

| О | Э | О → А, Э → А | | О → Ы |
|---|---|---|---|---|
| **Пад націскам пасля цвёрдых зычных:** | | калі націск пераходзіць на іншы склад: | | **У некаторых словах:** |
| го́рад | сэ́рца | гарады | сардэ́чны | бро́вы — брыво́, |
| ко́лас | цэ́гла | каласы́ | цаглі́на | гло́тка — глыта́ць, |
| маро́з | жэ́мчуг | маразы́ | жамчу́жына | дро́вы — дрыво́тня, |
| о́птам | крэ́мль | апто́вы | крамлёўскі | бро́д — брысці́, |
| о́пера | чэ́ргі | аперэ́та | чарга́ | кро́шка — крышы́ць |

**А**

- ва ўласных славянскіх імёнах і ў даўно запазычаных словах з іншых моў: Чалю́скін, Шаўчэ́нка, рамо́нт, сакрэ́т, хара́ктар і інш.;
  **але:** брызе́нт, дрызі́на, інжыне́р, канцыля́рыя, за́рыва, трыво́га, ма́рыва, рысо́ра, цырымо́нія;
- на канцы запазычаных слоў пасля галосных: ада́жыа, капры́чыа, сальфе́джыа, тры́а, Анта́рыа, Більба́а, Барне́а, То́кіа, Петру́чыа і інш.;
- -аль, -ар у запазычаных словах замест -эль, -эр: шні́цаль, фо́рталь, ба́раль, лі́дар, ме́неджар, мі́стар і інш.;
  **але:** ва ўласных імёнах — -эль, -эр: Ла́ндэр, Юпі́тэр і інш.



© ТДА «Аверсэв»

| | |
|---|---|
| **Э** | • у пачатку іншамоўных слоў: эпо́ха, эква́тар, Эўклі́д;<br>• у сярэдзіне іншамоўных слоў пасля шыпячых, [р], [д], [т], [ц]: жэто́н, цэнзу́ра, дэлега́т, чэмпіё́н, ветэран, Дэтро́йт, Жэне́ва, Шэкспір, Рэмарк і інш.;<br>• на канцы запазычаных нязменных слоў: ало́э, аташэ́, купэ́, рэзюмэ́, кашнэ́, Стру́вэ, Мерымэ́, Эйвэ́;<br>**але:** камюніке́, піке́, філе́;<br>• у вытворных ад слова сэ́нс: асэнсаваць, асэнсаваны і інш. |
| **Э або Е** | • у запазычаных словах пасля губных, [з], [с], [н]: капэ́ла, экзэмпля́р, маянэ́з, тунэ́ль, інтэрнэ́т, панэ́ль; газе́та, меда́ль, перспекты́ва, серві́з, шыне́ль<br>**!** Напісанне такіх слоў вызначаецца па слоўніку |

## 2. Правапіс Е, Ё — Я

| Пад націскам | У першым складзе перад націскам | У іншых складах перад і пасля націску |
|---|---|---|
| **Е** ле́с, ме́сці, дзе́вяць, дзе́сяць | **Е → Я** лясні́к, мяту́ць, дзявя́ты, дзяся́ты | ле[2]снікá[1], зáмець, дзе[2]вятна[1]́ццаць, дзе[2]ся[1]тко́вы |
| **Ё** вясёлы, далёкі | **Ё → Я** весялі́цца, далячы́нь | ве́се[1]ла[2], да[3]ле[2]чыня[1]́ |
| **Е → Я** | • у асобных даўно запазычаных словах: каляндáр, дзяжурны, яфрэйтар, сяржáнт, пляя́да;<br>**але:** сезон, легенда, веранда, секунда; | |
| **Е ў Я** не пераходзіць | • у першым складзе перад націскам пасля **г**, **к**, **х**: геро́й, гектар, Генадзь, Германія, Херсон і інш.;<br>**але:** гяу́р, кяры́з;<br>• у пачатку некаторых запазычаных слоў: епáрхія, ерэты́к, Егі́пет, Еўро́па, Еўфрат;<br>• у словах не і без | |



© ТДА «Аверсэв»

| | |
|---|---|
| **Я** незалежна ад націску | • ва ўласных імёнах: Якýб, Якубóвіч, Я́раш, Ярóшка, Ярашэвіч; • у некаторых каранях слоў: ві́цязь, сýвязь, зáяц, яравы́, мяккавáты, цягаві́ты, святкавáць, памяць, мéсяц, дзéсяць, Бéсядзь, ядлóвец, ядлаўцóвы; • у некаторых суфіксах назоўнікаў і дзеясловаў: вéялка, сéялка, бóязь, дрóбязь, роўнядзь, веяць, кашляць і інш. |

## 3. Правапіс спалучэнняў ІЕ (ЫЯ), ІО, ІЁ (ЫЁ), ІА, ІЯ (ЫЯ), ЕО (ЭО), ЕА (ЭА) у іншамоўных словах

| Спалучэнні: у руск. мове → у бел. мове | У пачатку слова | Пасля мяккіх зычных | Пасля цвёрдых зычных |
|---|---|---|---|
| **ИЕ → ІЕ (ЫЕ)** | іерогліф, іерархія, Іерыхон | гігіена, кліент, рэквіем | арыенцір, дыета, абітурыент |
| **ИО** → пад націскам **ІО, ІЁ (ЫЁ)** | іóн | біёніка, кіёск, аксіёма; **але:** ніобій, Эфіопія | рацыён, сацыёлаг; **але:** мільён, шампіньён |
| **ИО** → не пад націскам **ІА, ІЯ (ЫЯ)** | іанізáцыя, Іардан | біясфера, кіяскёр, аксіяматыка | рацыянальны, сацыялогія |
| **ИА → ІЯ (ЫЯ)** | | фіялка, Ніягара; **але:** мільярд | дыяметр, дыяганаль |
| **ЕО → ЕО (ЭО), ЕА → ЕА (ЭА)** | | неóн, геалóгія **але:** акіян | акардэóн, ідэалóгія |
| **ЙО → Ё (Я)** | маёр, раён, ёд, ёт, ёгурт (пад націскам); маянéз, раяні́раваць, маярáт (не пад націскам) | | |
| **ЙЕ → Е** | фае, феерверк, канвеер, Феербах | | |



© ТДА «Аверсэв»

## 4. Правапіс галосных у складаных словах

**Складанае слова** — гэта такое слова, якое мае ў сваім саставе дзве ці больш асновы.

Калі разглядаецца правапіс складаных слоў, то маецца на ўвазе напісанне злучальных галосных і галосных у першай частцы (аснове) слова.

| Правапіс злучальных галосных | | | |
|---|---|---|---|
| **о (ё)** | **а** | **е** | **я** |
| **пад націскам:** | **не пад націскам:** | **не ў першым складзе перад націскам:** | **у першым складзе перад націскам:** |
| ільнозавод,<br>святлолячэнне,<br>геліёграф,<br>радыёметр | велікадушны,<br>навамодны,<br>лёгкаатлетычны,<br>чырванакрылы | вогнетрыва́лы,<br>жыццесцвярджа́льны,<br>конегадо́ўля,<br>краевуго́льны | агняцве́т,<br>жыццяра́дасны,<br>баяздо́льны,<br>краязна́ўства |

| Правапіс галосных у першай частцы складанага слова | |
|---|---|
| **О (Ё)** | • калі першай часткай з'яўляюцца словы *збожжа-*, *слова-*, *мова-*, *проці-*, *што-*, *грос-*, *контр-*, *мота-*, *фота-*, *радыё-*: збожжасхо́вішча, словатво́рчасць, мовазна́вец, проціле́глы, штодзённы, гросма́йстар, контрігра́, мотало́дка, фотапейза́ж, радыёмая́к;<br>**але:** матаво́з, матацы́кл, фатагра́фія, кантрама́рка;<br>• калі націск падае не на першы склад другой часткі, а ў першай пад пабочным націскам праяўляецца о (ё): ро̀данача́льнік, лёдаўтварэ́нне, лёдадрабілка;<br>• калі другая частка пачынаецца з ў: збожжаўборка, марозаўстойлівы;<br>**але:** калаўрот |
| **А** | калі націск падае на першы склад другой часткі, акрамя адзначанай вышэй сітуацыі: скарахо́д, салява́р, баяздо́льны, даўгаве́чны, вакаме́р, вакаме́рны;<br>**але:** вокамгненны, вокамгненна, вокарухальны |



© ТДА «Аверсэв»

| | |
|---|---|
| **Е** | • захоўваецца ў першай частцы незалежна ад націску ў другой частцы: сенакасі́лка, белабры́сы, светапо́гляд; семсо́т, восемсо́т;<br>• калі другая частка пачынаецца з **ў**: зернеўбо́рачны, вогнеўстойлівы |
| **Э** | незалежна ад націску: мэтазго́дны, архэаво́дства, рэдказубы, шэсцьсо́т;<br>**але:** дрывасек, дрывакол, шасnаццаць, шасцігадовы, шасцісоты |
| в$\frac{е}{я}$лікі | калі націск падае на першы склад другой часткі, пішацца **е**, калі на другі — **я:** велікаду́шны, велікару́скі, велікаму́чанік (**але** Вялікдзень); вялікагало́вы, вялікадзяржа́ўны, Вялікабрыта́нія |

## 5. Правапіс прыстаўных галосных І, А

| Групы зычных | Прыстаўныя і, а пішуцца | Прыстаўныя і, а не пішуцца |
|---|---|---|
| З першымі **Л, Р** | Калі слова з групамі зычных:<br>• пачынае сказ: Ільны зацвітаюць. Аржаное поле бяскрайняе.<br>• стаіць пасля знака прыпынку: з шоўку, ільну; пшанічны, аржаны хлеб;<br>• папярэдняе слова канчаецца на зычны: мецць ільготы, мінуў аржанішча | Калі слова з групамі зычных стаіць пасля слова, якое канчаецца на галосны: кветкі рвалі, мука ржаная, грыва львіная, даецца льгота |
| З першым **М** | Прыстаўныя і, а пішуцца заўсёды: імчаў па дарозе газік; на імшарах журавіны; дол імшысты, вуллі ў амшаніку; па дрыгве, амшарах | |

**!** Пасля прыставак і першай часткі складаных слоў, якія заканчваюцца на галосныя, і, а не пішуцца: заржавець, зардзецца, замглёны, вокамгненна.
Дапускаецца напісанне: імшара і амшара, іржаны і аржаны, іржышча і аржанішча



© ТДА «Аверсэв»

## 6. Правапіс пры́стаўных зычных В, Г

| В пішацца | В не пішацца |
|---|---|
| **1. Перад у націскным:**<br>• у пачатку слова: вугал, вус;<br>• у сярэдзіне: павук, цівун, Навум;<br>• у вытворных ад гэтых слоў незалежна ад націску: вуглавы́, вуса́ты, павуці́нне, Цівý́ноў, Наву́менка, Навумо́віч;<br>• перад націскнымі прыстаўкамі у-, уз- (ус-): ву́праж, ву́згалаўе, ву́сцілка, вусціш | • перад **о, у** ў іншамоўных словах: опера, оптыка, ода, урна;<br>• у імёнах, прозвішчах, геаграфічных назвах: Оргіш, Осла, Об, Одэр, Уручча, Урал;<br>**але:** Вогненная зямля, Вольга;<br>• калі **у** — ненаціскная прыстаўка: увя́зка, удзе́л, умацава́нне, ураджа́й;<br>• калі **у** развілося з **в**: узгорак, улада, унук, уюн, узрушаны |
| **2. Перад о націскным:**<br>• у пачатку слова: восень, возера;<br>**але:** о́каць, о́дум;<br>• пасля прыставак: міжвоблачны, заворваць;<br>• у словах *вока*, *востры*, *вакол* і вытворных: вачаня́ты, вастры́ць, навастры́ць, нава-ко́лле | |

! Калі **о** пераходзіць у **а**, то **в** не пішацца: возера, але азёрны

**Г**
- у займенніках: гэты, гэтакі, гэтулькі;
- у прыслоўях: гэтак, гэтаксама, дагэтуль, пагэтуль

! Перад **і** ў іншамоўных словах **г** не пішацца: іронія, істэрыя, інтэрвал



© ТДА «Аверсэв»

## 7. Правапіс Ў нескладовага і У складовага

| Ў скарачаецца | У не скарачаецца |
|---|---|
| • пасля галосных:<br>– у пачатку слова: ра́ды ўсе, дзеці і ўнукі, для ўніятаў, да ўніверсітэта, ва ўніверсаме, да ўролага, гэта ўтопія;<br>– у сярэдзіне слова: край цудоўных людзей;<br>– у канцы слоў: бель снягоў, думаў думу;<br>• пасля злучка і двукосся, калі ім папярэднічае галосны: класна-ўрочны, жанчына-ўрач; ансамбль “Харошкі” ўзнагародзілі;<br>• у сярэдзіне некаторых іншамоўных слоў: аўтар, накаўт, аўтсайдар, раўнд, фаўна, клоўн, ноўтбук, саўна і інш. | • у пачатку ўласных назваў: Ганна Уласава, ва Уруччы;<br>• у пачатку і сярэдзіне слоў, калі на у падае націск: да у́рны, новыя у́нты, Брэсцкая у́нія, чулася у́ханне, ау́л, бау́л;<br>• у іншамоўных словах на -ум, -ус: акварыум, прэзідыум, радыус, соус, страус, натарыус;<br>• на канцы іншамоўных слоў: фрау, Дахау, Шоу, токшоу, ноу-хау;<br>**але:** шоўмен |

## 8. Правапіс прыставак на З-, С-

| **з-, із-, уз-, раз- (роз-), без- (бяз-), небез-, абез- (абяз-), праз-, цераз-** | **с-, іс-, бес- (бяс-), рас- (рос-), абес- (абяс-), церас-** |
|---|---|
| **перад звонкімі зычнымі і ётавымі галоснымі:**<br>з’інець, ізноў, уз’яднаць, разахвоціць, безаглядна, бязмежны, небеззаганны, абяззброіць, празмерны, цераззерніца | **перад глухімі зычнымі:**<br>скупіць, іспыты, бескарысны, бяскрылы, расказаць, росшук, абескаляроўваць, абясшкодзіць, церасsucceeded палосіца |



© ТДА «Аверсэв»

- калі корань слова пачынаецца з галосных **а**, **у**, **э** або ненаціскнога **і**, якое пераходзіць у **ы**, замест прыстаўкі з- пішацца с-: сарганізаваць, сумысна, сэканоміць, сыграць;

  **але:** зымправізаваць, зыначыць;

- у вытворных ад слоў ісці, хадзіць прыстаўкі на з- пішуцца ў залежнасці ад значэння: зысці — сысці, зыходзіць — сыходзіць, зыходны — сыходны, зысціся — сысціся;

- у прыстаўцы дыз- перад галоснымі пішацца з, а перад зычнымі — с: дызасацыяцыя, дыз'юнкцыя, дысгармонія, дыскамфорт;

- прыстаўка дэз- пішацца нязменна: дэзактывацыя, дэзарыентацыя, дэзынфармацыя, дэзынфіцыраваць, дэзынфекцыйны

## 9. Правапіс Ы, Й пасля прыставак

**Прыстаўкі канчаюцца**

**на зычны** + **на галосны**

| на зычны (ы ← і) | + | на галосны (і → й) |
|---|---|---|
| абысці | ісці | пайсці |
| падыграць | іграць | прайграць |
| безыменны | імя | займенна |
| зыначыць | іначай | перайначыць |

- Пішацца й таксама ў словах займаць, наймаць, пераймаць, пераймание, праймаць.

- Калі і ўтварае склад, то пасля прыставак на галосны вымаўляецца [й'і], а пішацца літара і: за[й'і]ка — заіка, за[й'і]нелы — заінелы, пра[й'і]нструктаваць — праінструктаваць.

- Пасля прыставак між-, звыш-, контр-, пан-, супер-, транс- вымаўляецца [ы], а пішацца і: міжінстытуцкі, звышідэйны, контрігра, панісламізм, суперінтэлект, трансіндыйскі



© ТДА «Аверсэв»

## 10. Правапіс ДЗ, Ц і Д, Т

| | |
|---|---|
| **ДЗ, Ц** | • перад **е, ё, ю, я, і, ь:** ідзеш (іду), цёхкаць (цокаць), дзюба (дуба), выцякаць (выток), дзікі, дзядзька;<br>• перад **[в'], [м']:** два — дзве, батва — бацвінне, цьмяны;<br>• у словах: дзверы, цвілы, яцвяг, ліцвін і інш.; **але:** твіст;<br>• перад суфіксамі **-ін-, -ір, -ік, -ёр, -еец, -ейск-:** плацiна, мундзір, рулецік, манцёр, індзеец, індзейскі |
| **Д, Т** | • пераважна ў іншамоўных словах: дэлегат, тэхніка, матэрыя, кандыдат, дысцыпліна, тырада, атэстат; **але:** дзюна, цюль, уверцюра, дзюшэс, нацюрморт;<br>• прыставачны **[д]** і суфіксальны **[т]** перад **[в']** не пераходзяць у **дз, ц:** надводзіць — надвяду, сялянства — сялянстве;<br>• у аддзеяслоўных назоўніках і вытворных ад іх: брыць — брытва, брытве, брытвенны; біць — бітва, бітве |

Ва ўласных іншамоўных назвах дз, ц, ці д, т пішуцца ў адпаведнасці з вымаўленнем: Авідзій, Барадзіно, Цюрынгія, Куцюр'е, Вучэціч, Адэлаіда, Адыс-Абеба, Тэвасян, Тэкерэй, Тыбет

## 11. Правапіс падоўжаных зычных

Падоўжанымі называюцца зычныя, якія знаходзяцца паміж галоснымі, вымаўляюцца працяжна і адносяцца да адной марфемы — кораня. Яны ўзніклі ў выніку страты ь і прыпадабнення й да папярэдняга зычнага: насе[ньй']е → насе[н'й']е → насе[н'н']е → насенне.
У беларускай мове 9 падоўжаных зычных, якія на пісьме перадаюцца дзвюма адпаведнымі літарамі.



© ТДА «Аверсэв»

| Падвоеныя літары | |
|---|---|
| **пішуцца** | **не пішуцца** |
| у спрадвечна беларускіх словах: падарожжа, суддзя, палоззе, калоссе, Залессе, ралля, натхненне, мыццё, бездарожжа, сучча, застрэшша; Аксіння; **але:** Ілья, Касьян, Ульяна, Юльян, вытворныя ад іх і ад слова ліць: лью, палью, пальеі інш. | у іншамоўных словах: маса, калекцыя, тона, акамадацыя, імунітэт, тэрыторыя; Ала, Эма, Васа, Джэма, Нона; **але:** ванна, бонна, донна, манна, мецца-сапрана, панна; Ганна, Жанна, Мадонна, Сюзанна |

## 12. Правапіс спалучэнняў зычных

У беларускай мове старажытныя спалучэнні зычных здн, рдц, рдн, стн, стл, лнц спрасціліся, таму ў сучаснай мове ў іх не пішуцца літары д, т, л.

| Спрашчэнне спалучэнняў | Прыклады |
|---|---|
| здн → зн | прыязны, выязны |
| рдц → рц | сэрца, сэрцайка |
| рдн → рн | міласэрны, міласэрнасць |
| стл → сл | усланы, шчаслівы |
| стн → сн | вусны, бязлітасны, аванпосны, баласны (і баластавы), кантрасны, кампосны, фарпосны |
| лнц → нц | сонца |
| дт → т | Гумбальт, Кранштат, Шміт |

# Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе

| **звонкія зычныя** | | **глухія зычныя** | **свісцячыя** | **шыпячыя** | **дц, тц, дч, тч** |
|---|---|---|---|---|---|
| на канцы слова: дуб [дуп] | у сярэдзіне слова: дубкі [дупкі] | перад звонкімі: просьба [проз'ба] | перад шыпячымі: сшытак [шшытак] | перад свісцячымі: спяшаешся [с'п'ашай'эс'с'я] | наградцы, цётцы, наладчык, лётчык |



© ТДА «Аверсэв»

| з, ж, ш, г, к + ск | мяккія зычныя | б, д у прыстаўках | д + ск | словы без, не |
|---|---|---|---|---|
| каўказскі, суражскі, чэшскі, выбаргскі | перад мяккімі: змена [з’м’эна], снег [с’н’эх] | абсушыць [апсушыц’], падсушыць [патсушыц’] | гарадскі [гарацк’і], лідскі [ліцк’і] | без кнігі — [б’ас] кнігі, не ведаў — [н’а] ведаў |

# Правапіс змякчальнага мяккага знака

| Пасля мяккіх зычных з, л, н, с, ц, дз | |
|---|---|
| **мяккі знак пішацца** | **мяккі знак не пішацца** |
| • на канцы слоў: мазь, нуль, алень;<br>• у сярэдзіне перад цвёрдымі зычнымі, калі мяккасць захоўваецца і перад мяккімі: пісьмо — на пісьме, вазьму — возьме, восьмы — васьмю;<br>• перад канчаткам **-мі** ў назоўніках творнага склону адзіночнага ліку: дзецьмі, коньмі;<br>• перад **-чык**, калі слова без **-чык** мае на канцы мяккі знак: агеньчык (агонь);<br>• перад **-ск-** у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на **-нь** і слова *восень*: студзеньскі, восеньскі;<br>• у **-еньк-**, **-эньк-**, **-аньк-**: беленькі, даражэнькі, шэранькі;<br>• у складаных лічэбніках: пяцьдзясят, шэсцьсот;<br>• у постфіксе **-сьці**: чагосьці;<br>• перад **-це**, **-ся**, **-ма** ў дзеясловах загаднага ладу: сядзьце, застанься, кіньма;<br>• у слове ледзьве | • паміж падоўжанымі зычнымі: сумленне, ралля, калоссе;<br>• у слове *ззяць*;<br>• пасля **з, с, ц, дз** перад мяккімі, калі пры змене слова абодва зычныя застаюцца мяккімі: песня — песні, звер — зверам, звяры;<br>**але:** носьбіт;<br>• перад **-ск-** у словах, утвораных ад назоўнікаў на **-нь** (але не ад назваў месяцаў на **-нь**): конскі (конь), хатынскі (Хатынь), цянь-шанскі (Цянь-Шань) |



© ТДА «Аверсэв»

# Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа

**Перад е, ё, ю, я, націскным і**

| мяккі знак | апостраф |
|---|---|
| • у іншамоўных словах: рэльеф, каньён, Кавеньяк, Льюіс, віньетка;<br>• у імёнах, прозвішчах, геаграфічных назвах перад -еў-: Аркадзьеў, Васільеўка, Лявонцьеў;<br>• пасля г, к, х і збегу зычных, акрамя нц, перад -еў- (-ев-) пішацца і(ы): Георгіеў, Яўціхіеў, Дзмітрыеў, Ануфрыевіч | • пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных: аб'езд, пад'ём, куп'ё, Барб'е, вераб'іны;<br>**але:** прыслоўе, салаўі, шчаўе, Іўе;<br>• у складаных словах пасля частак двух-, трох-, чатырох-, шмат-: трох'ярусны, шмат'якарны<br>Заўвага. Апостраф не пішацца пасля ў: абаўе, салаўі. |

# Правапіс вялікай літары

| З вялікай літары пішуцца | Прыклады |
|---|---|
| 1. Імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, псеўданімы, мянушкі людзей, клічкі жывёл; міфалагічныя істоты; дзеючыя асобы ў казках і байках; назвы боствай | Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (Якуб Колас); Хітры, Жмінда; Шарык, Лыска; Венера, Зеўс, Пярун; Сава, Асёл, Сонца, Дуб, Бог, Алах, Госпад, Уладыка Нябесны, Божы, Біблія, Дзед Мароз, Баба Яга |
| 2. Геаграфічныя і астранамічныя назвы, назвы дзяржаў і іх частак, частак свету, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, вуліц, плошчаў<br>! У састаўных назвах словы з родавым значэннем пішуцца з малой літары | Аўстралія, Нептун, Беларусь, Расійская Федэрацыя, Далёкі Усход, Полаччына, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Эльбрус, Свіцязь, плошча Свабоды, праспект Незалежнасці, Паўночны Ледавіты акіян, возера Свіцязь, мыс Добрай Надзеі, камета Галея |



© ТДА «Аверсэв»

| З вялікай літары пішуцца | Прыклады |
|---|---|
| 3. Першае слова ў большасці назваў гістарычных падзей, эпох, з'яў, гістарычных дакументаў, твораў літаратуры і мастацтва, святаў, знамянальных дат, міністэрстваў, устаноў і арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў, палітычных партый, кангрэсаў, з'ездаў і ўсе ўласныя імёны, якія ўваходзяць у склад такіх назваў | Версальскі мір, Парыжская камуна, Напалеонаўскія войны, Літоўская метрыка, Новы год, Вялікдзень, Другая сусветная вайна, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Міжнародны кангрэс беларусістаў, Аб'яднаная грамадзянская партыя, раман «Каласы пад сярпом тваім», фабрыка «Камунарка», выдавецтва «Народная асвета»;<br>**але:** Вялікая Айчынная вайна, Дзень Перамогі, дапятроўская эпоха, антычны свет |
| 4. Кожнае слова ў назвах вышэйшых дзяржаўных устаноў, пасад, некаторых міжнародных арганізацый, акрамя службовых слоў і слоў з родавым значэннем | Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый |
| 5. Прыметнікі, утвораныя ад уласных назваў, калі яны:<br>• указваюць на прыналежнасць;<br>• уваходзяць у склад назваў, роўных па значэнні назвам са словамі *імя*, *памяці* | Алесіна лялька, Антосева хата; Купалаўская прэмія (прэмія імя Янкі Купалы), Нобелеўская прэмія міру;<br>**але:** ахілесава пята, піфагорава тэарэма, праметэеў агонь, коласаўскі стыль, эзопаўская мова, сувораўская тактыка |
| 6. Усе словы ў назвах ордэнаў (акрамя слоў *ордэн*, *ступень*), калі яны не бяруцца ў двукоссе | ордэн Айчыннай Вайны I ступені, ордэн Славы II ступені, ордэн Францыска Скарыны, ордэн Маці, ордэн Пашаны |



© ТДА «Аверсэв»

| З вялікай літары пішуцца | Прыклады |
|---|---|
| 7. У назвах узнагарод, якія бяруцца ў двукоссе, з вялікай літары пішацца першае слова і ўласныя назвы | медаль «За ўзяцце Берліна», знак «Выдатнік народнай асветы»; **але:** медаль «Залатая Зорка» |
| 8. Лічэбнікі пры ўласных імёнах | Пётр Першы, кароль Альберт Другі |
| 9. Назвы кандытарскіх і парфумерных вырабаў, марак прамысловых вырабаў, якія пры гэтым бяруцца ў двукоссе | цукеркі «Беларускія», мыла «Дэльфін», пудра «Ліра», набор «Жадаю шчасця», трактар «Беларус», веласіпед «Школьнік» |

© ТДА «Аверсэв»